Гэтыя песні таксама звязаны з рытуалам завівання барады, якую ў народзе звалі «раёвай», «спарыповай». Цыкл песень прысвечаны рытуалу завівання барады, якая была звязана з цэлым радам міфалагічных і рэальных персанажаў -- «богава», «кумава», «Спяпанава». У гэтым цыкле найбольш распаўсюджаны песні з сюжэтам «Сядзіць казёл на капе ды дзівіцца барадзе», дзе тыповая фальклорная сітуацыя: у чужога гаспадара заўсёды дрэнна, а ў нашага -- добра.

Вялікі раздзел складаюць песні дажыначнага вянка. Вобраз вянка з'яўляецца скразным для веснавой і жніўнай паэзіі, а таксама звязаны з вяселлем. У многіх песнях пераплятаюцца матывы канца жніва, вянка, частавання, выкупу, усхвалення жней і гаспадароў у абстаноўцы жніўнага часу.

Заслугоўваюць увагі і сатырычныя матывы ў жніўных песнях, якія раскрываюць маральна-этычныя погляды земляроба. У гэтай групе песень, якія выконваліся на шляху да дома гаспадара і на застоллі, супрацьпастаўляюцца свае жнеі чужым. Упамінанне пра традыцыйнае частаванне сустракаецца амаль ва ўсіх жніўных песнях; тут і абяцанне гаспадара добра пачаставаць жней, і просьба жней пра добрае частаванне за працу, і просьба запрасіць музыкантаў, каб павесяліцца. Група песень, што выконваліся на застол-лі, маюць аналогію з каляндарнымі і валачобнымі пес-нямі, ў аснове якіх -- усласлаўленне багацця гаспадара, ідэалізацыя яго і яго сям'і.

Такім чынам, як і ўся каляндарна-абрадавая паэзія, паэзія і абраднасць жніўнага цыкла маюць працоўную аснову, песні звязаны з грамадскім бытам земляроба, адлюстроўваюць яго гаспадарчыя клопаты, светапогляд, мараль, адносіны да навакольнага свету.

Разам з рацыянальным пачаткам у паэзіі жніўнага цыкла нямала і ірацыянальнага. Гэта абумоўлена памылковымі ўяўленнямі нашых продкаў аб навакольным свеце, адухаўленнем імі розных сіл прыроды.

Лапчынская Л.В.,
ст.выкладчык

## СЛОВА Ў НАРОДНЫМ СВЯЦЕ

Сярод розных сродкаў у свяце слову належыць значнае месца. Слова ў абрадзе,рытуале існуе як магчымасць лагічнага дзеяння, якое ўжываецца з улікам асаблівасцей мясцовасці і часу.

Слова каранямі ўваходзіць ў святочнае дзеянне, якое складвалася вякамі, і ўтварае этнічную культуру, таму слова ўвасабляе мудрасць народа. З дапамогай слова ў святочным дзеянні адлюстроўваецца ўся гама пачуццяў яго ўдзельнікаў. Рознае па жанры і форме маўлення (маналагічнае, дыялагічнае) слова адлюстроўвае адносіны ўдзельнікаў да тэксту, надае значнасць інтанацыйнаму гучанню, увасабляе фанетычныя і лексічныя асаблівасці рэгіёна. Яно носіць розны характар у свяце (у рытуале слова сімвалічна). І гэта таксама дае магчымасць уздзейнічаць не толькі на розум, але і на пачуцці ўдзельнікаў святочнага дзеяння.

Слова рознае па тэмпу, рытму і моцы гучання. Яно непарыўна звязана з жэстам, мімікай, пластыкай, у свяце часта суправаджаецца музыкай. На жаль, гістарычны перыяд класічнага існавання моўнай традыцыі ў свяце знікае. Востра стаіць праблема стварэння і беражлівых адносін да гістарычнай духоўнай спадчыны слова.

Руплівыя адносіны да духоўнай гістарычнай спадчыны, вывучэнне слова ў народным свяце дапамогуць не толькі азнаёміцца з народнай паэзіяй, асаблівасцямі мовы, прасачыць яго сувязі з музыкай, пластыкай, жэстам, песняй, але і адкрыць метад работы над словам у свяце. Імправізацыя на творчай аснове як сродак засваення казак, прымавак, прыказак і іншых жанраў дасць магчымасць не толькі пазнаёміцца з народнай паэзіяй, асаблівасцямі мовы, яе сувязі з музыкай, спалучэння з элементамі іншых выразных сродкаў, але і будзе садзейнічаць фарміраванню творчых якасцей рэжысёра, захаванню этнічнай культуры.

Аверкава Н.К.,
выкладчык

## МОЎНАЕ ДЗЕЯННЕ Ў ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ РЭЖЫСЁРА СВЯТ

Адным з галоўных напрамкаў у комплекснай падрыхтоўцы рэжысёра свят з'яўляецца моўнае дзеянне. Менавіта яму належыць значная роля ў выхаванні рознабаковых прафесійных якасцей спецыяліста.

У сцэнарыі прадстаўленняў і свят непасрэдна ўваходзіць матэрыял розных літаратурных жанраў. І ўвесь гэты матэрыял павінен падпарадкоўвацца рэжысёрскай звышзадачы ў свяце. Задача рэжысёра заключаецца ў тым, каб навучыцца арганічна спалучаць розныя літаратурныя жанры ў залежнасці ад перспектывы скразнога дзеяння, авалодаць уменнямі і навыка-мі моўнага дзеяння ў гэтых жанрах. Слову належыць адно з вядучых месц у ажыццяўленні разнастайных функцый свята: камунікатыўнай, дзейснай, эстэтычнай, гістарычнай, нацыянальна-патрыятычнай, мастацкай, эмацыянальнай і інш. Такая значнасць слова ў свяце абавязвае рэжысёра грунтоўна авалодаць законамі моўнага дзеяння.

Найбольшае значэнне ў гэтай практыцы належыць жанрам публіцыстыкі. Увасабленне публіцыстыкі ў жывое дзейснае слова абумоўлена яе роляй ў фарміраванні асноўных прафесійных якасцей спецыяліста.

Паколькі публіцыстыка займае прамежкавае, сярэдзіннае месца паміж мастацкай і навуковай твор-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часцю, яна мае рад спецыфічных асаблівасцей, якія студэнту неабходна добра засвоіць.

Трэба адзначыць, што ў рамках самой публіцыстыкі сфарміраваліся асобныя тэматычныя разнавіднасці, апавядальныя формы і жанры.

Адну групу сярод іх складаюць вядомыя нам жанры газетна-часопіснай публіцыстыкі: карэспандэнцыя, каментарый, рэпартаж, артыкул і інш.

Другая група -- гэта жанры аратарскай (вуснай) публіцыстыкі: выступленне, даклад, прамова, гутарка.

Трэцюю групу складаюць творы мастацкай публіцыстыкі. Гэта нарысы, лірычныя замалёўкі і іншыя жанры. Яны характарызуюцца мастацкай выразнасцю, эмацыянальнасцю, філасофскім абагульненнем. Менавіта ў творах мастацкай публіцыстыкі спалучэнне якасцей публіцыста як даследчыка і мастака выяўляецца непаўторна.

Характэрным для рэжысёра свят з'уляецца тое, што, ажыццяўляючы мастацкае, маральнае, адміністрацыйнае кіраўніцтва пэўным калектывам людзей, ён у сваёй практыцы не можа мінуць публіцыстычнае слова як сродак пераканання, выхавання і распаўсюджвання ведаў. А гэта патрабуе ад рэжысёра ўмення быць самому пераканаўчым, здольным захапіць сваёй задумай, заразіць аўдыторыю жывым эмацыянальным словам, падпарадкаваць сваёй волі.

Чарняк Ю.М.,
канд. мастацтвазнаўства,
дацэнт

## УПЛЫЎ ФЕСТЫВАЛЯЎ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ НА ЭСТЭТЫКУ СУЧАСНАГА ПРАФЕСІЙНАГА МАСТАЦТВА

У шэрагу раёнаў Рэспублікі Беларусь адраджаецца даўняя традыцыя правядзення фестываляў народнай творчасці раённага, рэгіянальнага маштабаў. Болей дзесяцігоддзя праходзяць «Браслаўскія зоры» на Віцебшчыне, «Палескі карагод» на Брэсчыне, аналагічныя фестывалі ў Мозыры і Тураве на Гомельшчыне, у Мядзелі, Слуцку, Чэрвені на Міншчыне, а таксама ў іншых месцах. Не абмежаваныя жанравымі рамкамі і не заўсёды мэтанакіраваныя, яны тым не менш сталі выдатнай магчымасцю ўсплёску народных дараванняў, выканання старых і новых песень, танцаў, музычных твораў. Іх вопыт, безумоўна, увабралі ў сябе фестывалі апошніх 4 гадоў, якія актыўна множацца і, што асабліва каштоўна, набываюць добра дасведчаных кіраўнікоў і тлумачальнікаў. Гэтым фестывалям спадарожнічае новы ўзровень асэнсавання і прафесійнага вывучэння з пункту гледжання адраджэння нацыянальных фальклорных вытокаў і традыцый. Найбольш паказальныя ў гэтым сэнсе харэаграфічныя фестывалі 1990 г. ў Гародні, потым «Пярэзвы» ў 1992 годзе ў Бабруйску (як агляд калектываў Гомельшчыны і Магілёўшчыны), а ў наступным 1993 годзе -- ў Чачэрску, рэспубліканскі фестываль сямейнай творчасці, які праходзіў у студзені 1994 года ў Слоніме. Асноўныя вынікі гэтых фестываляў -- высвятленне рэгіянальных асаблівасцей у розных жанрах народнай творчасці (у тым ліку строяў), што набывае ўсё больш важнае значэнне для пашырэння і распаўсюджання фальклорна-этнаграфічных ведаў.

Але самае, можа быць, істотнае і нечаканае грунтуецца на тым, што магутна заявіўшая пра сябе тэма адраджэння вытокаў беларускага фальклору адлюстравалася ў прафесійнай творчасці розных напрамкаў і жанраў. І менавіта гэты ўплыў з асаблівай выразнасцю выявіўся на міжнародных фестывалях, таму што супастаўленне сучасных тэндэнцый у мастацтвах розных краін найбольш відавочна выяўляе характэрныя рысы нацыянальнага.

Аб гэтым ярка сведчаць пошукі беларускіх тэатральных рэжысёраў, спектаклі якіх былі паказаны на Міжнародным фестывалі ў Мінску «Студыйныя каляды--91». У пастаноўках «Сялянская вайна» І.Кафта (мінскі тэатр-студыя «Дзе-Я», рэж.М.Трухан), «Янка Купала» (Мінскі тэатр гістарычнай камедыі і драмы, рэж.В.Матросаў), «Смешныя і грэшныя людзі мае» паводле Я.Купалы і Л.Радзевіча (Мінскі музычна-драматычны тэатр) з поўнай яснасцю адчувалася, што тэатральны спектакль пакідае звычайныя кананічныя формы, каб наблізіцца да абраду, рытуалу, умоўных формаў народнага тэатра-відовішча.

Не менш выразная карціна склалася і на паказах беларускіх лялечных тэатраў у дні 2-га Міжнароднага фестывалю ў Мінску ў маі 1993 г. Пры тым, што спектаклі чатырох гарадоў Беларусі «Зязюлькі» (Магілёў, рэж.А.Жугжда), «Цар Град» (Мінск, рэж.А.Ляляўскі), «Тутэйшыя» (Гродна, рэж.М.Андрэеў) і «Папялушка» (Віцебск, рэж.В.Клімчук) зусім розныя, па сведчанню крытыкі, «самая агульная, характрэрная рыса, якая вылучыла іх з фестывальнага кантэксту, -- гэта схільнасць да фальклору».

І яшчэ адно цікавае назіранне, што ляжыць у рэчышчы гэтых разважанняў. На 2-м Міжнародным фестывалі-семінары «Я люблю балет», які быў ажыццёўлены ў 1993 годзе, адзначалася шчодрая эмацыянальнасць танцаў «народнікаў». Фестываль заўсёды -- паказ дасягненняў. Відавочна, што дасягненні мастацтваў Беларусі -- гэта перш за ўсё адраджэнне нацыянальнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ